педалям с подвижной динамикой, которые призваны создать звукообраз колокола. При условии тембровой насыщенности каждого голоса и достаточном числе певцов возникает эффект гудящего колокола – символа мироздания.

Необычное для древнерусских богослужебных песнопений наличие как солирующих партий хора, так и солистов объясняется не только желанием автора разнообразить фактуру сорокаминутного полотна и не утомить слушателя постоянной многоголосной звучностью, но и стремлением указать на символическое значение такого пения, приближенного к респонсорному.

УДК 069.8(476)

# КАНЦЭПТУАЛЬНЫЯ ПАДЫХОДЫ ДА НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ Ў МУЗЕЯХ БЕЛАРУСІ

***В. В. Навіцкая,***

*намеснік дырэктара па навуковай і асветніцкай рабоце музея «Замкавы комплекс “Мір”» (г. п. Мір), саіскальнік вучонай ступені кандыдата культуралогіі, установа адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

**Анатацыя**. У артыкуле засяроджваецца ўвага на канцэптуальных падыходах да навукова-даследчай дзейнасці ў музеях Беларусі. Вылучаюцца агульныя напрамкі даследчай працы для ўсіх музеяў і кірункі, якія залежаць ад профілю. Разглядаюцца роля і месца навукова-даследчай дзейнасці ў сучасных беларускіх музеях, падкрэсліваецца важнасць публікацыі вынікаў даследаванняў.

**Ключавыя словы:** музей, навукова-даследчая дзейнасць, канцэптуальныя падыходы, музеязнаўства.

**CONCEPTUAL APPROACHES TO SCIENTIFIC RESEARCH ACTIVITIES IN THE MUSEUMS OF BELARUS**

***O. Novitskaya,***
*Deputy Director for Scientific and Educational Work of the Mir Castle Complex Museum, Competitor of a Scientific Degree of Candidate of Culturology of the Educational Institution "The Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk, Belarus*

**Abstract.** The article focuses on the conceptual approaches to scientific research activities in the museums of Belarus. There are general directions of scientific research work for all museums and directions that depend on the profile. The role and place of scientific research work in modern Belarusian museums are studied, and it is emphasized the importance of publishing scientific research results.
**Keywords:** museum, scientific research activities, conceptual approaches, museum studies.

Дзейнасць любога музея прама ці ўскосна абапіраецца на навуковыя пошукі і даследаванні. Адмысловая роля ў гэтым працэсе ў нашай краіне належыць буйным установам, такім як Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць-герой», Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры, музей «Замкавы комплекс “Мір”», Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік «Нясвіж», Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа і інш.

Некаторыя беларускія музеі выступаюць у якасці навуковых і метадычных цэнтраў. Так, напрыклад, з ліпеня 2008 г. пры Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь быў утвораны цэнтр Дзяржаўнага каталога Музейнага фонду Рэспублікі Беларусь. Таксама ў гэтым музеі прадугледжана правядзенне работы па навукова-метадалагічным і навукова-лінгвістычным забеспячэнні дзейнасці не толькі Дзяржаўнага каталога, але і ўвогуле ўсіх музейных устаноў. Маецца на ўвазе распрацоўка слоўнікаў, уніфікаваных даведнікаў і стандартаў апісання музейных прадметаў [4].

Асобна трэба ўлічваць, што Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік функцыянуе як навукова-даследчая і асветная ўстанова культуры, у склад якой уваходзіць 11 музеяў. Браслаўскае раённае аб’яднанне музеяў з 2001 г. прадстаўлена як навукова-даследчая ўстанова культуры, што ўключае Браслаўскі гісторыка-краязнаўчы музей, Музей традыцыйнай культуры, Музей прыроды і этнаграфіі з экспазіцыяй камянёў і драўлянай скульптуры, фондасховішча, аб’яднанне майстроў «Ля возера» [2].

Што тычыцца Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка, то навукова-даследчая работа з’яўляецца адным з асноўных напрамкаў для навуковых супрацоўнікаў і праводзіцца па музеялогіі, гісторыі, архітэктуры, літаратуры, мастацтве, беларускаму кнігадрукаванню і выдавецкай дзейнасці, педагогіцы, музейнай сацыялогіі, прыродзе рэгіёна, экалогіі, этнаграфіі [7].

Аднак першараднымі для ўсіх музеяў, у тым ліку для абласных і раённых, з’яўляюцца навуковыя тэмы, якія адпавядаюць профілю – гісторыя, прыродазнаўства, этнаграфія, мастацтвазнаўства і г. д., а таксама тэмы, звязаныя з вывучэннем музейных прадметаў, калекцый і асяроддзя іх бытавання, гісторыі аб’екта і яго ўладальнікаў (асабліва, калі ідзе гаворка пра музеі, размешчаныя ў помніках архітэктуры). Не выключэннем з’яўляюцца даследаванні па камплектаванні і захаванні музейных прадметаў і калекцый, іх экспанаванні.

Узрастанне ролі навукова-даследчай дзейнасці ў беларускіх музеях намецілася ў пачатку 1990-х гг. Аднак частка музейных супрацоўнікаў не была згодна з тым, каб вярнуць навуку ў музей. Яны бачылі ролю навуковага супрацоўніка як інтэрпрэтатара, пасрэдніка паміж даследчыкам-вучоным і наведвальнікам музея [5, с. 252–253]. Дыскусія па гэтым пытанні не раз адбывалася на старонках перыядычнага друку ў той час. Беларускі музеёлаг А. А. Гужалоўскі рашуча выказваўся за тое, што толькі вяртанне навукі ў музей дазволіць стварыць нацыянальныя музеі сусветнага ўзроўню [3]. Услед за ім большасць беларускіх музеяў, у тым ліку Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, выказалася за пашырэнне ролі навуковай дзейнасці і дасягнула значных вынікаў у вывучэнні фондавых калекцый, правядзенні канферэнцый і г. д. [5, с. 253].

Дыскусійнае пытанне «Ці патрэбны ўвогуле навуковыя супрацоўнікі ў музейных установах?» вымушае звярнуцца да тлумачэння паняцця «музей». У артыкуле 159 Кодэкса аб культуры Рэспублікі Беларусь пазначана, што «музей – гэта арганізацыя культуры або падраздзяленне юрыдычнай асобы, якія выяўляюць прадметы музейнага значэння, камплектуюць музейныя фонды, ажыццяўляюць на пастаяннай аснове ўлік і захоўванне музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў, вывучэнне, выкарыстанне і папулярызацыю музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў» [6]. Такім чынам, на першае месца пастаўлены тыя напрамкі дзейнасці, якія непасрэдна звязаны з працай навуковых кадраў устаноў.

Увогуле існуе мноства канцэптуальных мадэляў у разуменні тэрміна «музей», якія вылучаюць даследчыкі: музеязнаўцы, музеёлагі, культуролагі, гісторыкі. Сярод асноўных, маючых дачыненне да тэмы даследавання, можна вылучыць наступныя:

– музей як навукова-даследчая ўстанова (Д. І. Цвярская) [8];

– музей як інстытут, які, у першую чаргу, заняты захоўваннем артэфактаў, элементаў матэрыяльнай культуры мінулага і валодае пэўнай наяўнасцю калекцый, што з’яўляюцца асновай большасці форм музейнага абслугоўвання (С. Пірс) [10, с. 198];

– музей як грамадская ўстанова, якая сістэматычна збірае, захоўвае і апрацоўвае сапраўдныя дакументы аб развіцці прыроды і грамадства, выкарыстоўвае іх для развіцця навукі і адукацыі, а таксама рэалізуе сваю місію як цэнтр культурнага прадстаўніцтва з увасабленнем прагрэсіўных традыцый і патрыятызму, даследчы і культурна-асветніцкі цэнтры (Ё. Бенеш) [9, с. 148] і г. д.

Сярод пералічаных аспектаў разумення тэрміна «музей» толькі расійская даследчыца Д. І. Цвярская падводзіць у сваіх працах да вылучэння на першае месца разгляду музея як навукова-даследчай установы. На яе думку, супрацоўнікі музеяў не могуць абмежавацца выкарыстаннем вынікаў даследаванняў, якія ажыццяўляюць іншыя арганізацыі. Яны павінны весці самастойныя даследаванні, публікаваць іх вынікі і менавіта на гэтым фоне прадэманстраваць тое новае, што адкрыта і распрацавана імі самімі [8, с. 6].

Д. І. Цвярская вылучае як агульныя напрамкі даследчай работы для ўсіх музеяў, так і кірункі, якія залежаць ад профілю

музея. Да агульных яна адносіць даследаванні ў напрамку вырашэння праблем музеязнаўства, пачынаючы ад гісторыі музеяў, пытанняў успрымання экспазіцый, навуковых метадаў музейнай работы і канчаючы праблемамі, звязанымі з забеспячэннем фізічнай захаванасці музейных прадметаў. Напрамкі, якія залежаць ад профілю музея, грунтуюцца на прадметах, што складаюць іх асноўны фонд. У навуковым даследаванні яна вылучае тры галоўныя этапы:

1) выбар і пастаноўка праблемы;

2) збор матэрыялу, яго аналіз і апрацоўка (апісанне, кваліфікацыя);

3) рашэнне праблемы на аснове сінтэзу атрыманых даных.

Да даследаванняў, якія патрабуюць правядзення ўсіх трох этапаў, яна адносіць вывучэнне праблем, звязаных са стварэннем экспазіцый, падрыхтоўку дакладаў, артыкулаў, манаграфій па музеязнаўчых напрамках і ў рэчышчы профільных дысцыплін. Да даследаванняў, дзеля якіх дастаткова толькі двух першых этапаў, Д. І. Цвярская адносіць складанне картак навуковага апісання, вызначэнне музейных прадметаў, іх класіфікацыю і сістэматызацыю, стварэнне на гэтай аснове навуковых каталогаў, спецыяльных даведнікаў (напрыклад імянных слоўнікаў майстроў, вытворчых клейм і г. д.) [8, с. 10–11].

Разважаюць таксама ў сваіх артыкулах аб значным месцы навуковых даследаванняў у музеі беларускія навукоўцы доктар гістарычных навук прафесар М. А. Бяспалая [1] і старшы выкладчык кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў БДУ Н. М. Здасюк [5]. Яны спасылаюцца на публікацыі А. М. Разгона, Л. Т. Сафразьяна, Д. І. Цвярской і згаджаюцца, што для паспяховага функцыянавання ўсіх відаў музейнай дзейнасці неабходна правядзенне навуковых даследаванняў як у галіне музеязнаўства, так і ў галіне профільных навук. Таксама яны акцэнтуюць увагу на тым, што навукова-даследчую дзейнасць у музеі нельга разглядаць асобна, без папулярызацыі яе вынікаў, без стымулявання цікавасці да навуковага пошуку ў моладзі і садзейнічанню распрацоўцы праектаў як у навуцы, так і ў культуры.

У апошні час зноў намецілася небяспечная тэндэнцыя пераўтварэння музея ў цэнтр правядзення вольнага часу пры скарачэнні і нават адмове ад навуковых даследаванняў. Аднак

трэба памятаць пра тое, што менавіта вывучэнне музейных прадметаў (калекцый, збораў) мае вялікае значэнне для правядзення камплектавання і ўліку музейных фондаў, рэалізацыі экспазіцыйнай работы, развіцця навукова-даследчай дзейнасці гэтых устаноў.

У сваіх артыкулах М. А. Бяспалая падзяляе кірунак навукова-даследчай дзейнасці ў музеі на такія сегменты, як навуковае камплектаванне фондаў, навуковыя даследаванні ў галіне захавання музейных прадметаў, комплексныя даследаванні пры стварэнні экспазіцый і выставак і інш. Яна звяртае ўвагу на тое, што культурная і асветніцкая дзейнасць музеяў таксама грунтуецца на навуковых распрацоўках многіх навук: педагогікі, псіхалогіі, сацыялогіі. У аснову другога кірунку навукова-даследчай дзейнасці ў музеі, звязанага з профільнымі навукамі, яна ставіць музейныя калекцыі, што складаюць крыніцазнаўчую базу [1, с. 113].

Навуковыя даследаванні ў музеі ў рамках профільных навук у цэлым адпавядаюць тым напрамкам навуковага пошуку, якія характэрны для навукова-даследчых устаноў. Музейныя супрацоўнікі ў сваіх даследаваннях надаюць увагу вывучэнню фондаў або засяроджваюць увагу на распрацоўцы тых тэм і пытанняў, якія маюць значэнне для канкрэтнай музейнай установы і яе профілю і недастаткова вывучаны ў профільных дысцыплінах. Гаворка ідзе перш за ўсё пра даследаванні крыніцазнаўчага характару, накіраваныя на выяўленне дакументуючых уласцівасцей музейных прадметаў і іх значэнне для развіцця профільных дысцыплін. Такім чынам, маючы адзіны прадмет даследавання, музеі і спецыялізаваныя навуковыя ўстановы выконваюць пры гэтым розныя функцыі. Музеі заняты зборам, захоўваннем, першаснай апрацоўкай і сістэматызацыяй крыніц, абагульненнем атрыманых даных. Спецыялізаваныя немузейныя ўстановы заняты, з аднаго боку, глабальным абагульненнем, з другога – даследаваннямі зусім вузкай скіраванасці зыходзячы з таго, што ў музеях няма спецыялістаў такога кшталту. Каардынацыя даследаванняў музеяў з дзейнасцю іншых навуковых устаноў дазваляе прадухіліць неапраўданае дубліраванне і няўзгодненасць пры рашэнні агульных задач.

Такім чынам, існуюць усе падставы лічыць, што беларускія музеі вядуць дастаткова разнастайную навукова-даследчую

дзейнасць, якая праводзіцца па двух асноўных напрамках: у кантэксце музеязнаўства і профільнай навукі. У іх ёсць усе магчымасці таксама праводзіць уласныя пошукі, якія носяць міждысцыплінарны характар, і займацца вывучэннем музейнай аўдыторыі, гісторыі і тэорыі музейнай справы.


*1. Бяспалая, М. А.* Навукова-даследчая дзейнасць цэнтральных музеяў Беларусі : агульнае і асаблівае / М. А. Бяспалая // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2010. – № 2. – С. 112–117.

*2.* Браслаўскае раённае аб’яднанне музеяў [Электронны рэсурс] // Анлайн-энцыклапедыя НББ «Беларусь у асобах і падзеях». – Рэжым доступу: https://bis.nlb.by/ru/documents/145705. – Дата доступу: 17.03.2019.

*3. Гужалоўскі, А. А.* Сёння і заўтра беларускіх музеяў / А. А. Гужалоўскі // Культура. – 1992. – № 6. – С. 2.

*4.* Дзяржаўны каталог Музейнага фонду [Электронны рэсурс] / Афіцыйны сайт Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь. – Рэжым доступу: http://histmuseum.by/by/museum/dkmfby/. – Дата доступу: 25.02.2022.

*5. Здасюк, Н. М.* Научно-исследовательская деятельность музеев Беларуси на современном этапе / Н. М. Здасюк // Музеология – музееведение в начале XXI века : проблемы изучения и преподавания : материалы Междунар. науч. конф., Санкт-Петербург, 14–16 мая 2008 г. / отв. ред. А. В. Майоров. – СПб., 2009. – С. 252–257.

*6.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронны рэсурс] : 20 ліп. 2016 г. № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. – Рэжым доступу: http://www.pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413. – Дата доступу: 10.03.2019.

*7.* Навуковая дзейнасць [Электронны рэсурс] // Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. – Рэжым доступу: http://polotsk. museum.by/be/node/32287. – Дата доступу: 11.03.2022.

*8. Тверская, Д. И.* Музей как научно-исследовательское учреждение / Д. И. Тверская // Музейное дело в СССР : сб. науч. тр. / ред. И. М. Поспелова. – М., 1974. – С. 5–17.

*9. Beneš, J.* Československé muzejnictví včera, dnes a zítra / Josef Beneš // Národopisné aktuality. Krajské středisko lidového umění ve Strážnici. – 1988. – Č. 3. – S. 145–148.

*10. Pearce, S. M.* Thinking about things / S. M. Pearce // Museums J. – 1986. – Vol. 85. – № 4. – P. 198–201.